дзён было такое нешчасьце: пара коні аднаго пана спужаліся і панясьлі з гары, сам пан, што ехаў ня мог іх стрымаць і толькі сам ужо трымаўся, каб хоць жывым астацца, а каб кіраваць і гутаркі не было. Коні з усяго імпэту звярнулі у другую вуліцу і драбіна с цэлай сілай і з усяго разгону стукнулася аб сьцену дома і прыбіла на сьмерць старую кабеціну-жыдоўку, каторая на другі дзень і памерла. Гэта бывае усюдых, што бываюць выпадкі, раптоўнай сьмерці, калецтва, нешчасьця і ніхто у гэтым ня вінен. Але у нас у Валожыне віна падае у сьмерці на тых, каму трэба глядзець за дарогамі, а не глядзяць. У самым мястэчку, у самай сярэдзіне яго вялікая гара, каторая раздзеляе мястэчка на дзьве палавіны і усякі павінен праежджаць праз гэту нешчасную гару. Даўней, гадоў таму 12, быў гаспадарны чэлавек прыстаў Нікольскі, каторы выбрукаваў, як у мястэчку, так і палавіну гары,—скончыць ня мог, бо раптоўна памёр. З году на год дарога усё псавалася, а ніхто і ня думаў правіць. Цяпер у Валожыне жывуць: земскі, прыстаў, сьледавацель—ўсе ўласьці і ніхто ні падумае дарогу на гарэ паправіць. Прыстаў мае пару коні і харошы фаетон і як яму трэба ехаць праз мястэчка, то аб'ежджаець кругом, праз двор графа, каб абмінуць гару. Земскі так сама робіць, а на дарозі лежаць каменьня вялікіе, па пудоў 50 і 100, вымытые вадой і ямы парабіліся глыбінёй чуць не на аршын, так, што як селянін едзе адным канём, то трымаецца за драбцы, каб ня вылецець і з шырокай дарогі, аршын 10, цяперь можна пераехаць толькі адным канём, бо ўсюдых вялізные каменьня і ямы. Што да сьмерці жыдоўкі, — гэта ня першае здарэньне: кожны год бывае некалькі калецтв, але ніхто аб гэта не дбае, запішуць толькі у паперы пратакол і на гэтым канец. Пішучы гэта маю тую надзею, што можэ прачытае хто колечы такі, каму гэта ведаць належыць і зробіць парадак, бо яго у нас саўсім німа.

*Янка Тутэйшы.*

# Мінск.

## У Мінскім акружным судзе

Апошнімі днямі Судзілі тут нейкаго М. Александровіча, сына судзебнаго следавацеля, акончыўшаго 4 клясы слуцкай гімназіі. На лаву падсудзімых яго прывяла беднасьць і ніўдача дастаць якую колечы работу дзеля пражыцьця. Ен усюды звертаўся, каб дастаць службу ці якое колечы заняцьце, і нігдзе яго не прынялі; тады паехаў у Маскву да блізкага сваяка, дзе думаў найсьці работу, але і там ні ўдалося, і мусіў валяцца на вуліцах. Начуючы з басякамі, спазнаўся з нейкім Федоровым, каторы парадзіў яму назвацца студэнтам і пісаць просьбы да багатых людзей аб грошы; ён так і рабіў, але начальство пачало сачыць басякоў, і Александровічу прышлося уцякаць з Масквы. Перад гэтым Федоров аддаў яму свой портфэль з рознымі фальшывымі дакумэнтамі: Гэты портфэль Ал. пакінуў у булачнай, а булачнік аддаў яго ў паліцію.—гэтак і папаўся Александровіч пад суд, перад каторым 11 месяцеў прасядзеў у турме.

На судзе яго апраўдалі і злажылі яму некалькі грошы на хлеб.

### Перамена

Быўшаго упраўляючаго мінскай спархіей-спіскапа Іоанна з вікарыяцкаго становішча ў Адэссе—назначылі ў Таганрог.

Нават сам сынод прызнаў усе палітычные абмылкі яго ў час быўшай мінскай выбарнай кампаніі ў 4-ую Гасударств. Думу, калі епіскоп Іоанн уздумаў злучыць у адно націоналістаў зусім адменнай фарбы; „архірэйскіх“ і „паліцэйскіх“

Гэткая трушанка нарабіла немала клопату ў Пецярбурзе, і па загаду адтуль перэцярабілі некаторых важнейшых памочнікоў епіскапа: выхрэста Мэндэля Шоффэра і быўшаго правіцеля канцэлярыі губэрнатара—Петрова.

Хоцькі—ня—хоцькі драпануў пан Шоффэр з Мінска, а з ім ці не драпанула і запамога для газэты ,,С. З. Ж.“—12,000 рубельчыкоў, бо новый заступнік і выдавец гэтай газэты—,,пераезжая свацьця“—пан Солоневіч сам прызнаецца, што яму прыдзецца класьці ,,зубы на паліцу.“

Друкарві Некрасова газэта ,,С.-З. Ж.“ вынавата больш. 500 рубл. Прысланым па належные грошы наборшчыкам з друкарні п. Солоневіч абецаўся заплаціць, як вернецца с Пецярбургу (абецанка цацанка...), дзе ён мае ,,матку—надзею“ пажывіцца каля ,,націоналістоў.“

Бадай, ці ўсерасейскае націанальное зборышчэ, даўшы ўжо раз на гэты год газэці падмогу, каторую пан Мэндэль Шоффэр ,,змэндляваў,“ пакваціцца даваць другі раз...

Вось вам і ,,патрыотычная“ праца паноў націоналыстоў!

### Аб выбарах у гарадзкую думу.

Пратэст падмястовікоў — выбаршчыкоў у гарадзкую думу проці ўсіх ,,штук і штучэк“ старадумцаў падчас выбароў у думу, куды праслізнуліся толькі ,,цэнтравікі“, затуманіў галаву ,,галаве“ нашаго гораду—п. Хржонстоўскаму і ўсей яго кампаніі, бо вісіць страх, каб часам не адмянілі гэтых выбароў. Проціў гэтаго паны Хржонстовскіе пусьцілі ў ход усю сваю хітра—мудрую машынэрыю, абы як колечы дабіцца прызнаньня выбароў.

Пан сэкратар чорнасоценнай газэты Солоневіча ,,С. З. Ж.“— Д. Бохан, цяперашні земскі чыноўнік, с падмогай свайго швагра—стара-думца—Амброшкевіча як мага стараецца упхнуцца ў гарадзкую думу на ,,затаўку“. Гэтая затаўка абойдзецца ў месяц толькі...200 рубл. Ну, але затое пан Бохан абецаецца скакаць пад уселякую дудку, на якой толькі не зайграе палітыка, бо і сам майстар нішто іграць хоць на якой дудцы.

Само-сабой разумеецца, што ўся частка (хоць і невялікая яна) паступова—культурных ,,думцоў“ гэтай музыкі і гэтых скокоў зусім чураецца.

*Мікола Камароўскі*

### Новае крэдытнае таварыство

Міністэр фінансаў пазволіў аткрыць у м. Городзея Мін. г. Слуцк. павету таварыство ўзаемнаго крэдыту з нормальным „статутам“

### Выстаўку адлажылі.

Аткрыцьце Мінскай Штукарска-этнографічнай выстаўкі, каторае было назначэно на 4-е мая, адлажылі на 11 мая.

### Суд за рэшаты.

Ракоў, Мінск. губ. і пав. Было гэта прошлаго году у нашым мястэчку Ракаве. У мястэчку ёсць адзін рашотнік, каторы вырабляе рашоты і сіты, аж тут з вёскі Галімцоў такжэ пачаў адзін чэлавек выбрабляць рэшаты і прывозіць у Ракоў у панядзелкі прадаваць. Гэта не падабалася ракоўскаму рашотніку і ён напрасіў некалькі чэлавек ракоўскіх мешчаноў, каб яго выбілі. Яны пайшлі на дарогу на пярэймы яму, але таго чэлавека перэсьцяраглі, то ён узяў стражніка, каб той правёў за мястэчка. Але разбоінікі не паглядзелі і на стражніка і як зьверы напалі с палкамі і так збілі, што у галаве зрабілі аж дзевяць дзірак. А і стражніку шаблю сарвалі с плеч. Гэтых разбойнікоў пасьля арэштавалі і пасадзілі у клапоўнік. Прайшло блізка з год ад гэтаго разбою. Цяпер быў суд у Мінску у акружным судзе, то трох асудзілі на дзесяць месяцоў у астрог с пазбаўленьнем некаторых правоў, двох на пяць месяцоў і аднаго на два месяцы. Іх былі на болей засудзіўшы, але трохсотлетняя гадаўшчына зняла крыху кары.

Вот да чаго даводзіць зайздрасць.

*І. М.*

### Пажар цэрквы.

Кіевец, Мінск. губ. і пав. Красавіка 22 дня згарэла тут парахвіальная царква. С тэй прычыны, што забыліся затушыць вугалі у кадзельніцы. Згарэла усё да пасьледку, нічога ня здолелі з яе вынясьці.

*М.*

### Вялікдзень.

В. Клянік, Верхмінскай воласьці. Ігуменскаго павету. Сустрэчаць Хрыстова Уваскресеньне сабралася многа людзей у Верхмінскую цэркву. Палілі штучные агні, пушчалі „ракеты“. Каля цэрквы наклалі колькі агнеў. Стаяць кругом, паважна гамоняць. Глядзіш з далеку і трудна паверыць, што гэта той самы земляроб. Вот блеск скрыў яго бледны твар, ды на душы у яго весялей. Глядзіш і с сэрцем робіцца нешта такое, здаецца плакаў бы, плакаўбы наўзрыд, як мала дзіца. І хочецца абняць кожнаго, ва усю сілу прыхінуцца да яго грудзеў, пачуць, як бьецца яго сэрцэ і кожнаму сказаць: брат, сьмялей глядзі у перад! І нашэ жыццё закрасуецца і нам шчасьцэ усьміхнецца!

Сьвята у Кляніку праводзяць звычайна: пьюць, лаюцца, бьюцца. На другі дзень Вялікадня прыйшлося адліваць вадою селяніна Кудзіна. На трэці — ізноў чуць не пачалася „добрая бойка“. Два хлопцы—Алесь Арцімовіч і Мікола Мурашка добра наклеілі адзін аднаму. Дзякаваць старасту, што ён развёў іх і адабраў у аднаго с кішэні камень. Ешчэ сьвяточная тутэйшая гульня—„дучкі“. Зробяць невялічкую ямку „тачок“ у зямлі і кідаюць туды круглыя галачкі шкляныя, волавяныя або і гліняныя. Галачак 6. Адзін кажэ: мой цот, другі—лішка. Укоціцца цот — выйграў той, што казаў цот, праграў—што гаварыў лішка. Другіе стаяць наўвакол і закладаюцца адзін з адным. Адзін кідае галачкі, а можэ гуляць хоць усё сяло. Гуляюць на грошы. Гэтак праводзяць час і дзеці. Яны гуляюць на гузікі ці на запалкі. Бывае, што не паладзяць і пачынаюць трашчэці лысіны.

А сонейка гэтак прыемна сьвеціць, пяюць птушачкі, древы усе зялёненькія! Здаецца просяцца, цягнуцца да цябе сваімі галінкамі с пахучымы лісточкамі, завуць падайсьці да іх! Гэткае хараство на ўвакол, што можна забыць пра ўсе чорныя мары, пра ўсё жыццё з яго бруднымі рэчамі. Паглядзішь навакруг—і на душы робіцца ціха-ціха, сэрцэ раўней бьецца, грудзі сьмялей уздымаюцца. Божэ, думаеш, які харошы Твой сьвет, колькі у ім хараства, багацьця! Усяго хваціць для ўсіх, ніхто не павінен быць скрыўджэны! Зрабі, Міласьцівы, каб людзі, якіх Ты паставіў гаспадарамі ўсяго Свайго стварэньня, не зніштажалі яго, каб

---

У нашаго Прахора білета ніаказалася, дык яму аж апрацівела ждаць. Пакуль білетных аглядалі, то ён і сядзеў, і еў і тупаў, а ў рэшці такі і да яго прышла калейка. Вот Прахор палажыў торбачку і шапку ў куточку каля дзвярэй прыёмнай і ўвашоў.—«Здрастуйця, барынька! і кінуўся пацалаваць у руку, але дохтар ні даў.—«Ну развяжы і пакажы што у цябе з вокам», сказаў дохтар. Прахор хуцянька зняў фанту з вока. Дохтар глянуў раз і пачаў распытываць як і што было. Прахор расказаў усё без утайкі.—«Вот што я табе скажу»,—вымавіў дохтар выслухаўшы „каб ты на першых часах не пашоў к свайму знахару, а кінуўся да дохтара, то вока было-б цэлая, а цяпер нічога табе супакойнаго сказаць ні магу; зараз напішу табе рэцэпт, ты купіш у аптэцы зелля і будзеш ім разы тры, ці чатыры ў дзень заліваць і завязваць свае вока, а як выйдзе ўсё зельля, то прыедзь зноў ка мне, я пагляджу, можна будзе зрабіць апарацію і тады будзеш бачыць».—Прахор хораша падзякаваў дохтару, даў яму паўрубель, ды нешта каля двух рублеў упёк за зельля і паехаў дамоў.

Толькі што Макрэна выпаліла у печы, падмяла у хаці і села лапіць дзяціные сарочкі, як уходзіць Прахор. Тут дзеці апступілі яго, чакаючы гасцінца, а Марка, дык той ляскаючы рукамі стаў прыпеваць:—„Тата плыехаў ехаў, тата плыехаў—хаў!..“—Прахор абдзяліў іх абаранкамі. Дзеці паселі на палацях, перш добра палюбаваліся на абаранкі, а потым сталі па трошку кусаючы есьці, каб на больш хваціла.

Нічога нікажучы жонцы, Прахор раздзеўся, скінуў боты, выняў с торбы зельля с пляшкаю паставіў на вакно і сам прысеў к сталу. Макрэна зноў нічога не пытаючы дастала с печы яду і ужо ставячы перад Прахорам на стол спытала:—„Як жа-ж там у Міньську... што?..“—„А нічога, вот даў нейкаго зельля і казаў як вымачаю, то прыехаць зноў к яму будзе рабіць нейкую лапарацу.“—Йшчэ лапарацы нейкія ад вока ёсьць?“—«Хто-ж іх ведая, тыж бачыш, што ё.» На том разгавор і кончыўся. Прахор пад'еўшы заліў зеллям вока і лёг атдыхаць з дарогі, Макрэна прыбраўшы са стала, зноў села лапіць.

Вот прышла святая нядзелька. Дзянёк удаўся харошы, цёпляньскі. І старые і малые павысыпалі на вуліцу. Вышоў і Прахор дзержацы на руках Марку к мужчынам, што сядзелі на бярвеньні і балакалі а том а сём. Усё ужо ведалі, што прахор быў у Міньську і сталі распытаваць як было дзела. Прахор стаў расказваць і толькі дзела дайшло да лапарапі, як тут найшоўся адзін знаток, як гэту лапарацу робяць. Ея зваўся Франук, шмат гдзе шляўся па зарабатках і лічыўся у вёсцы бывалым чэлавекам. Вось гэты Франук і кажэ Прахору: „Ды ты ведаяш, што гэта за лапараця такая?“ чы-ы, то-то, што ня ведаяш, дык я-ж табе скажу. Калі воку робяць апарацу, то чэлавека ложаць на такі стол і прыкручваюць пружынамі, каб ён ні варухнуўся, а потым бяруць шчыпчыкамі вока, выймаюць яго з ямкі і яно вісіць на аднэй жылцы, потым ачышчаюць яго ножыкам, абмываюць, дый зноў устаўляюць у ямку. А бывае, што гэтая жылка як небудзь парвецца, тады і воку карачун. Во, дык калі хочаш быць бяз вока, то едзь на апарацу... а боль жа-ж якая бывая-у-уй!.. Мой Прахор і рот разявіў, пачуўшы гэта.—«Вот што-о-о... ну дык ніхай-жа я лепш бачыць ня буду, ды ні паеду, хай яно там прападзе... Бач... лапарацу выдумаў—яму абы грошы узяць»... Тут і другіе мужчыны сталі адраджваць Прахору ехаць, але ужо ён і сам ні паедзе хоць тут абсып яго золатам. Франук с храбрасьці, што збавіў чэлавека ат такой бяды, скруціў тоўстую папіросу, зацягнуўся разоў пару і сярдзіта плюнуў.

С тых пор Прахор кінуў і думку ехаць да Міньска, закінуў негдзя ешчэ ня кончэная зельля і толькі часам успамінаючы расказ Франука, ўздрыгаўся ат страху перад апарацяю. Цяпер мы яго ўсягды бачым з шапкаю надзетаю так на галаву, што казырок закрывае сляпое вока і ён ходзячы ўсё глядзіць сабе пад ногі, а як трэба яму паглядзець куды небудзь дальш, то ён хіліць галаву на бок і настаўляя зрачая вока так, як певянь, калі яму трэба паглядзець у верх на варону. Раз я яго спытаў:—«Ці бачыш ты што небудзь сваім вокам?» „Не. нічога. Вот як махаю перад вокам рукою, то відаць, што нешта мятусіцца, і дзе вакно, то відаць сьвет, а больш нічога.“—«А на што ты закрываеш яго казырком?»—„Калі мне здаецца, што ўсе на мяне глядзяць—сорана неяк“.

**Аліпеньчык.**

